УДК 94(476)

М.М. Кароль, канд. гіст. навук
(БДЭУ, г. Мінск)

# ПРАБЛЕМА ЗАКАНАДАЎЧАГА АФАРМЛЕННЯ КАНФЕСІЙНЫХ КАНВЕРСІЙ У РАСІЙСКАЙ ІМПЕРЫІ Ў ПАЧАТКУ XX ст.

У пачатку XX ст. у Расійскай імперыі ўзнікла неабходнасць ажыццяўлення змен у рэгуляванні дзяржаўна-рэлігійных адносін. Хаця ўжо ў 1860-я гг. выказвалася думка аб пашырэнні правоў розных рэлігій, рэформы былі праведзены толькі з прызначэннем Дзмітрыя Святаполк-Мірскага міністрам унутраных спраў [1, с. 112–113].

Галоўнымі дакументамі, якія адлюстравалі гэтыя змены, сталі маніфест ад 26 лютага 1903 г. і ўказ ад 12 снежня 1904 г., якія падкрэслівалі пануючы статус праваслаўнай царквы, але дазволілі іншаверцам свабодна вызнаваць сваю веру. Заканадаўчыя рэформы завяршыліся ўказам ад 17 красавіка 1905 г. «Аб умацаванні асноў верацярпімасці», але прапаведніцкая дзейнасць неправаслаўных па-ранейшаму была забаронена.

Нягледзячы на пашырэнне рэлігійных правоў, існавалі супярэчнасці з крымінальным правам, якое па-ранейшаму карала публічныя выказванні супраць праваслаўнай веры. Указ ад 25 чэрвеня 1905 г. змякчаў крымінальнае пераследаванне за негвалтоўнае спакушэнне праваслаўных, але больш за 30 крымінальных артыкулаў, якія абмяжоўвалі права выбару веравызнання, былі адменены толькі ў 1906 г. [1, с. 160].

З 1866 па 1891 гг. у праваслаўе былі пераведзены 92 252 каталікі, а пасля ўказа 1905 г. у беларускіх губернях у каталіцтва перайшлі 15 684 праваслаўныя [2, с. 180]. За 1905–1907 гг. з праваслаўя ў каталіцтва перайшлі 40 024 чалавекі, што адлюстравала захаванне часткай каталікоў сваёй рэлігійнай ідэнтычнасці, нягледзячы на фармальную прыналежнасць да праваслаўя. Вяртанне вернікаў пачалося амаль адразу пасля ўказа «Аб умацаванні асноў верацярпімасці», які быў хутка падтрыманы каталіцкім касцёлам. Пры адсутнасці афіцыйных тлумачэнняў з боку ўлад віленскі біскуп Эдуард фон Роп выдаў цыркуляр, які рэгуляваў парадак прыняцця новых вернікаў.

Істотнай праблемай было тое, што ўлады слаба інфармавалі насельніцтва пра новае заканадаўства, і многія не ведалі пра яго змест. Адсутнасць тлумачэнняў з боку праваслаўнай царквы і ўлад ускладняла працэс канверсій. За першыя чатыры месяцы дзеяння ўказа многія людзі перайшлі ў каталіцтва, але іх не выкрэслілі з праваслаўных спісаў.

У Віленскай губерні, напрыклад, 20 000 чалавек перайшло з парушэннямі працэдуры. Улады вырашылі прызнаць гэтыя пераходы правамоцнымі, нягледзячы на парушэнні, і патрабаванне аформіць іх юрыдычна было пастаўлена толькі ў 1915 г. Цыркуляр № 4628, прыняты 18 жніўня 1905 г., вызначаў працэдуру для тых, хто жадаў змяніць веравызнанне, але фактычна заставаўся бюракратычным бар’ерам [3, арк. 48]. Паводле цыркуляра № 4628 Міністэрства ўнутраных спраў, чалавек, які жадаў змяніць веравызнанне, павінен быў напісаць заяву губернатару. Мясцовае павятовае начальства павінна было паведаміць праваслаўнаму святару пра намер верніка выйсці з праваслаўя для правядзення «пераконваючай» гутаркі. Заява разглядалася на працягу месяца і перасылалася іншаслаўным святаром для прыняцця рашэння. Пасля гэтага святары паведамлялі аб змяненні веравызнання губернатару, які інфармаваў праваслаўнае духавенства [4, с. 657]. Такім чынам, заява была сродкам для арганізацыі ўліку вернікаў розных канфесій і фактычна не была прашэннем аб дазволе верніка да змены канфесіі (насіла ўведамляючы характар).

Пераход з праваслаўя ў каталіцтва быў складанай бюракратычнай працэдурай, якая патрабавала падачы заявы на імя губернатара. Неабходна было пацвердзіць грамадзянскае паўналецце (21 год) і добраахвотнасць пераходу, а мясцовы святар мог спрабаваць адгаварыць жадаючых. Напрыклад, з сялянкай Ракаўскай воласці Мінскага павета Марыяй Анкутай тройчы праводзілася размова перад тым, як даць ёй дазволам на пераход [5, арк. 55].

Частка людзей ігнаравала намаганні святара, але калі той падаваў прашэнне аб забароне пераходу, праводзілася дэталёвае расследаванне. Толькі пасля гэтага асобу выкрэслівалі з праваслаўнага спісу і заносілі ў каталіцкую парафію. Частай праблемай было непаўналецце просьбіта, як у выпадку непаўнагадовай сялянкі Мінскага павета Алены Бабовіч, якую вянчаў ксёндз без неабходнага дазволу [5, арк. 55]. Пры гэтым сама А. Бабовіч казала, што не ведала, свой дакладны ўзрост.

Перавод у каталіцтва мог быць фармальным: тая ж М. Анкута не наведвала споведзь пасля канверсіі, і ксёндз проста запісаў яе ў спіс парафіянаў. Адвакаты ксяндзоў, абвінавачаных у незаконным пераводзе, сцвярджалі, што сапраўдная канверсія магла адбыцца толькі пасля здзяйснення адпаведных абрадаў.

Адсутнасць дакладных правілаў міжканфесійных пераводаў уносіла блытаніну ў дзейнасць святароў. Пытанне, што рабіць з тымі, хто перайшоў у каталіцтва да цыркуляра ад 28 жніўня 1905 г., было асабліва актуальным у рэгіёнах, дзе з 1860-х гг. многа людзей таемна

вызнавалі каталіцтва і ўтваралі групу так званых «упартых у лацінстве». Праваслаўныя святары не ведалі, як улічваць такіх прыхаджан. Напрыклад, благачынны Навагрудскага павета протаіерэй Фелікс Сцяпура паведамляў пра сітуацыю ў Ліпаўскай царкве, дзе ўсе «упартыя ў лацінстве» перайшлі ў каталіцтва. У выніку праваслаўны епіскап мінскі і тураўскі Міхаіл (Цемнарусаў) загадаў скласці спісы былых «упартых» і даслаць іх у кансісторыю для выключэння з праваслаўя [6, арк. 32].

Такім чынам у пачатку XX ст. адбываўся працэс лібералізацыі рэлігійнага заканадаўства Расійскай імперыі, які ўключаў указ ад 17 красавіка 1905 г. «Аб умацаванні асноў верацярпімасці», што дазваляла змяніць сваю канфесію. Аднак адсутнасць канкрэтна выкладзенай працэдуры пераходу стварала бюракратычныя перашкоды для жадаючых. Нягледзячы на гэта, у першыя месяцы пасля прыняцця ўказа адбылося шмат пераходаў, што было звязана з актыўным заахвочваннем каталіцкага духавенства і вялікай колькасцю «упартых у лацінстве». Указ уплываў не толькі на дзяржаўна-царкоўныя адносіны, але і на штодзённае жыццё насельніцтва, змяняючы адносіны ўнутры вёсак і сямей.

ЛІТАРАТУРА

1. Сафонов А.А. Государство и конфессии в позднеимперской России: правовые аспекты взаимоотношений. – Москва: Проспект, 2007. – 352 с.

2. Яноўская В.В. Хрысціянская царква ў Беларусі, 1863–1914 гг. – Мінск: БДУ, 2002. – 197 с.

3. Lietuvos valstybės istorijos archyvas. – F. 378. Ap. 1905. B. 403. – Справа аб парадку пераходу з праваслаўя ў іншыя веравызнанні. 1905–1910 гг.

4. Ясевич-Бородаевская В.И. Борьба за веру: историко-бытовые очерки и обзор законодательства по старообрядчеству и сектантству в его последовательном развитии с приложением статей закона и высочайших указов. – Санкт-Петербург: Гос. Тип., 1912. – 696 с.

5. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (далей – НГАБ). – Ф. 183. Воп. 2. Спр. 23826. – Справа па абвінавачванні адміністратара Ракаўскага касцёла Яўстаха Карповіча ў незаконным далучэнні да каталіцызму праваслаўнай сялянкі Алены Бабовіч. 1912 г.

6. НГАБ. – Ф. 136. Воп. 1. Спр. 37171. – Прашэнні аб змене канфесійнай прыналежнасці. 1905 г.